Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-05-16




**8 мая ўрачыстымі мерапрыемствамі завяршыўся юбілейны X Міжнародны студэнцкі лёгкаатлетычны прабег, арганізаваны Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам і Іжэўскім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам імя М.Ц.Калашнікава. Сёлетні маршрут пралёг праз расійскія гарады Іжэўск, Чабаксары і Ніжні Ноўгарад, а канцавым пунктам стаў горад-герой Мінск. Мерапрыемства было прысвечана 68-годдзю перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і 70-годдзю Сталінградскай бітвы.**

# Прабег Дружбы і Памяці

Адной з прыгожых заключных дзей быў масавы прабег з удзелам студэнтаў-спартсменаў БНТУ, ІжДТУ, Ніжагародскага ДТУ, а таксама наймацнейшых спартсменаў Савецкага раёна Мінска ад плошчы Калініна па праспекце Незалежнасці да галоўнага вучэбнага корпуса Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. А там з шарамі, транспарантамі і кветкамі ўдзельнікаў прабегу сустракалі прадстаўнікі ўсіх факультэтаў і маладзёжных арганізацый БНТУ — усяго каля 400 чалавек. Каля стэлы, прысвечанай супрацоўнікам і студэнтам Беларускага політэхнічнага ўніверсітэта, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, адбылося велічны мітынг-рэквіем. Прысутных віталі рэктар БНТУ, акадэмік НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар, член Нацыянальнага алімпійскага камітэта Барыс Міхайлавіч Хрусталёў; рэктар ІжДТУ імя М.Ц.Калашнікава, доктар тэхнічных навук, прафесар Барыс Анатольевіч Якімовіч; рэктар Ніжагародскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя Р.Я.Аляксеева, доктар тэхнічных навук, прафесар Сяргей Міхайлавіч Дзмітрыеў; міністр адукацыі Удмурцкай Рэспублікі, доктар эканамічных навук, прафесар Андрэй Леанідавіч Кузняцоў; намеснік старшыні адміністрацыі Савецкага раёна Мінска Аксана Леанідаўна Волкава; прадстаўнік Таварыства беларускай культуры ў Удмурцкай Рэспубліцы Мікалай Дзмітрыевіч Украінец. З сардэчным прывітаннем да ўдзельнікаў прабегу і ўсіх маладых людзей, што сабраліся на мітынг, звярнуўся ветэран Вялікай Айчыннай вайны, які змагаўся ў складзе III Беларускага і I Далёкаўсходняга франтоў, узнагароджаны 9 медалямі за баявыя заслугі і 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, былы дэкан факультэта транспартных камунікацый БНТУ, дацэнт кафедры супрацiўлення матэрыялаў Іван Архіпавіч Голубеў.

Святочны ўрачысты настрой удзельнікам мітынгу дапамагалі ствараць творчыя калектывы БНТУ — народны духавы аркестр і ансамбль танца "Дружба", а таксама саліст вакальна-эстраднай студыі Аляксандр Бабрыковіч.

Да помніка студэнтам, супрацоўнікам і выкладчыкам БПІ, якія загінулі ў гады вайны, былі ўскладзены кветкі. X Міжнародны студэнцкі лёгкаатлетычны прабег стаў сапраўды прабегам Дружбы і Памяці.

**Мікола ЧЭМЕР.**

*gilevitch@ng-press.by*